*Фядотаў А.Г.*

# УЗОРЫ ТРАДЫЦЫЙНАЙ НАРОДНАЙ АБРАДНАСЦІ У СВЯТОЧНАЙ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСКАГА ГОРАДА XVIIст.

Узаемаадносіны традыцыйнай народнай абраднасці і гарадской святочнай культуры маюць шматвекавую гісторыю, якая характарызуецца узаемаўплывамі і супрацьстаяннем, наяўнасцю агульных рыс і кардынальных адрозненняў; гісторыю, у ходзе якой ствaралася святочная культура беларускага народа. Вопыт першых спроб укаранення традыцыйных святочных форм ва ўмовах сучаснага горада, азначаны шэрагам памылак і мастацкіх страт, пераконвае у неабходнасці грунтоўнага вывучэння генезіса узаемаадносін дзвюх святочных культур: традыцыйнай, народнай і гарадской. Гэта з'яўляецца актуальным і сацыяльна-значным, паколькі без гэтых ведаў немагчыма стварэнне сучасных гарадскіх святочных форм, заснаваных на нацыянальнай традыцыі.

На працягу доўгага часу гарадскія святы поўнасцю капіравалі сялянскую традыцыю. Гаспадарка жыхароў гарадоў і асабліва больш шматлікіх мястэчак, дзе побач з мяшчанамі жылі і сяляне, якія карміліся з зямлі і працы на ёй, спрыяла захаванню сярод гарадскога насельніцтва традыцыйнай святочнай абраднасці. Архетып шматвекавой народнай традыцыі святкавання, насычанай элементамі язычніцкіх культаў, на Беларусі быў вельмі устойлівы. Нават у больш позніх часы, па меркаванню даследчыкаў, "з усіх усходніх славян у канцы XIX ст. календарная абраднасць больш за ўсё захавалася у беларусаў". [1,268.].

У той жа час моцны ідэалагічны і маральны кантроль з боку царкоўнага прыходу выключаў магчымасць пранікнення ў гарадское асяроддзе святкаванняў з яскрава вызначанымі язычніцкімі элементамі. Рэгламентацыя гарадскога жыцця нормамі заходнееўрапейскага (магдэбургскага) права, іншая сацыякультурная і этнаканфесійная структура насельніцтва, блізкасць да ўлады і падзей дзяржаўнага жыцця актыўна ўплывалі на выпрацоўку новай гарадской мадэлі святочнай культуры. З найбольш устойлівых традыцыйных святаў, якія пранікаюць праз "гарадскія муры", трэба адзначыць: Каляды, Вялікдзень, Сёмуху і Масленку. У працэсе прыстасавання да новых умоў гарадскога жыцця аграрна-магічны бок святаў істотна змяняецца, а іх структурныя элементы падвяргаюцца шэрагу мадыфікацый.

Хрысціянізацыя каляднага абраду вызначыла традыцыйную дату яго святкавання – Ражство Хрыстова, а таксама адбілася на характары



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

святочных дзей. Выкарыстанне масак, травесційнае пераапрананне, якія хрысціянская царква абвясціла "д'ябальскімі падкопамі", замяняюцца выкананнем рэлігійна-містэрыяльных дзей лялечнага тэатра "батлейка", а таксама "хаджэннем з зоркай", падчас якога выконваліся духоўныя калядкі і рацэі, пабудаваныя на аснове біблейскіх сюжэтаў [2, 37]. Звяртае на сябе увагу той факт, што еўрапеізацыя ўсіх галін жыцця закранула і сферу распаўсюджвання ў горадзе традыцыйнай народнай культуры. Полілінгвізм некаторых калядак, якія звычайна складаліся студэнтамі духоўных школ, сведчыць аб уплыве культуры заходнелацінскага кола. У спалучэнні з мясцовымі формамі фальклору гэтыя калядкі набывалі выгляд, уласцівы менавіта беларускай святочнай традыцыі, якая бытавала ў асобных рэгіёнах краю:

"З калядой *omnes* advos ідзем к вам,
Ешчэ *gratis* вельми міла будзе нам.
*Gloria Laus* Богу ўсі заспеваем
Гаспадарам *Largum vesper* ўраз прызнаем,
І хай *Deus* блаславіць пры споры
Дамы, людзей, гумна, клеці, аборы."
[3, 48.]

У Віцебску найбольш актыўнымі удзельнікамі святкавання Ражства Хрыстовага былі студэнты хрысціянскіх школ. Згодна Указа ваяводы Яна Храпавіцкага, толькі студэнты езуіцкай школы мелі права "хадзіць з Калядою" ў межах усяго Віцебска.[4, 41.]. У той жа час уніятам і праваслаўным дазвалялася калядаваць толькі у межах свайго прыходу, што парушала прынцып адзінай святочнай прасторы, уласцівы для традыцыйнага вясковага святкавання.

На трансфармацыю каляднай, а таксама велікоднай абраднасці значны ўплыў аказаў дакладны саслоўна-іерархічны падзел гарадскога насельніцтва. У адрозненне ад традыцыйнага вясковага калядавання, у якім калядоўшчыкі атрымліваюць падарункі за пажаданне гаспадарам шчасця і дабрабыту, ва ўмовах горада гэты абрадавы элемент падпаў пад істотную мадыфікацыю. Шырокае распаўсюджанне атрымлівае практыка паднашэння падарункаў ("каляднае") на Ражство Хрыстова прадстаўнікам свецкай і царкоўнай улады, зафіксаваныя крыніцамі ў шэрагу гарадоў Беларусі ў 1671, 1697, 1680 і 1709гг. Так, у 1680 годзе войт і члены магістрату хадзілі з "калядой" да замка магілеўскага падстарасцега, а таксама рабілі грашовыя паднашэнні ксяндзам і іншым знакамітым асобам. [5, 92.]. Аналагічныя паднашэнні ("валачобнае")

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

практыкаваліся і падчас Велікоднага свята. Акрамя грошай, падарункі складаліся з "рэдкіх вострых прыпраў, цукру і іншых прадуктаў". [5, 145]. Крыніцы захавалі звесткі, якія дазваляюць зрабіць выснову аб падтрымцы азначаных традыцый гарадскімі уладамі. У 1695г., улады абвінавачвалі гараджан Пінска і Турава, якія адмовіліся даваць "калядное" і "валачобнае" пад час урачыстага выезду епіскапа на кафедру ў Ражство Хрыстова і Св.Пасху, у "занядбанні даўняга звычаю". [6, 114-115.]. Гэта сведчыць аб афіцыялізацыі народнага абраду, які ва ўмовах горада набывае выгляд афіцыйнага паднашэння.

Таксама сувязь з народнай традыцыяй прасочваецца ў гарадскім святкаванні Тройцы, якая, дзякуючы намаганням хрысціянскай царквы, замяняе старажытнае свята Семік, звязанага з язычніцкім культам ушанавання раслiннасці. З вялікага абрадавага комплекса Семіка гарадскія кнігі выдаткаў згадваюць аб набыцці "маю да ратуша"(май 1671); альбо "Купілі маю о духу святому"(май 1680).[5, 105,149,150.]. Семушная зяленіна, якая па старажытных вераваннях засцерагала ад усялякай нечысці, прадухіляла навальніцу і градабой, лячыла шматлікія хваробы, - ва ўмовах горада ператвараецца ў святочнае аздабленне афіцыйных устаноў, гарадскіх брам і культавых будынкаў. Ролю майскага дрэва і траецкай зяляніны часцей за ўсё выконвала бярозка і яе галінкі.

Істотная трансфармацыя азначаных святаў ва ўмовах горада тым не менш захоўвала іх сувязь з традыцыйнай народнай абраднасцю ў "падабенстве асобных элементаў", а таксама "ў агульным духу святкавання, якое узыходзіць да народнай смехавай культуры карнавала" [7, 35.]. Найбольш яскравыя карнавалізаваныя рысы захавала ў гарадах Масленка – свята, глыбінна звязанае з веснавымі абрадавымі ігрышчамі, накіраванымі на вяснавое абнаўленне прыроды. Масленка, "сырная нядзеля", (ці "zapusty" - польск.-Аўт.), размешчаная у календары напярэдадні Вялікага посту, з яго строгай хрысціянскай устрыманасцю і аскетычнай рэгламентацыяй жыццёвых паводзін, стымулявала людзей правесці апошнія дні перад пастом у віхуры масленічнага карнавалу з пачуццём радасці, гуллівасці і забаў. Нягледзячы на адмоўнае стаўленне царквы, якая лічыла Масленку рудыментам язычніцтва і называла "bacchanalia", падчас свята па вуліцах і дамах хадзілі ражаныя дзядамі, цыганамі, яўрэямі, анёламі, пастухамі, салдатамі і г.д. Аб папулярнасці свята ўскосна сведчыць дыялог з масленічнай драмы школьнага тэатра XVIст. "Мясапусная камедыя", у якой студэнт у спрэчцы з ксяндзом спасылаецца на народную традыцыю святкавання. Ён кажа, што на масленку "ўсе весяляцца таму, што звычай патрабуе ў

гэтыя дні піць, танцаваць, гуляць, пераапранацца, гуляць камедыі і, наогул, забаўляцца"[8, 33.]. Шматканфесійны характар беларускіх гарадоў, у якіх значную колькасць насельніцтва складалі прадстаўнікі каталіцкай і асабліва уніяцкай канфесій, дазваляе з вялікай доляй верагоднасці лічыць, магчымым бытавання на масленку згадваемага Е.Кітовічам вольнага, пазацаркоўнага стылю паводзін. Гэта праглядвалася ў тым, што "добра апранутай пані, якая ішла ў касцел, непрыкметна падвешвалі прадметы чорнай магіі"; "у жартоўным пакаранні дарослых дзяўчат,што не ўступілі у шлюб"; "у абліванні вадой" і іншых шкалярскіх штукарствах[7, 37]. Святкаванне масленкі ахоплівала пераважную большасць хрысціянскагя насельніцтва гарадоў (не выключаючы прадстаўнікоў шляхецтва.). Шырокі абрадава-гульнявы комплекс свята, які сумяшчаў элементы зімовай і вясновай абраднасці, у горадзе губляе свой магічны змест і ператвараецца ў яскравае карнавалізаванае дзеянне забаўляльнага характару.

Нягледзячы на спецыфічныя рысы сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця беларускіх гарадоў, узаемадзеянне вясковай і гарадской культур мела пастаянны і непарыўны характар. Сацыяльна-эканамічныя зносіны паміж горадам і вёскай у разгледжваемы перыяд, давалі шырокія магчымасці для разнастайных кантактаў гараджан і вяскоўцаў, што спрыяла актыўнаму культурнаму абмену. Буйныя гарады Беларусі звычайна валодалі навакольнымі вескамі; даволі часта Іх жыхары ўваходзілі у гарадское апалчэнне, якое прымала ўдзел у гарадскіх афіцыйных і цырымоніях. Крыніцы захавалі звесткі аб масавым уключэнні сялян у гарадскія ўрачыстасці для выканання традыцыйных абрадавых дзей [9, 169]. У шэрагу свят купцоў і рамеснікаў ("хрэсьбіны", "нараджэнне", "вяселле") працягвалі бытаваць элементы традыцыйнай народнай абраднасці. Па меркаванні Катлярчука А.С., "сістэма вобразаў народнай валачобнай песні (святыя-апекуны) аказала ўздзеянне на фарміраванне патранажа рамесніцкіх цэхоў на Беларусі XVIIст." [10, 192].

Вельмі важнай зонай культурнага ўзаемадзеяння горада і вескі, у разгледжваемы перыяд з'яўляліся святочныя таргі (кірмашы,) якія пачалі праводзіцца ў Вялікім княстве Літоўскім ужо у XV ст. і суправаджаліся народным гуляннем. Як зазначае даследчык беларускага кірмаша П.Гуд, "штогоднія святочныя таргі, з моманту свайго ўзнікнення, цесна перапляталіся з духоўнай культурай народа"[11, 79.]. Звычайна кірмашы прымяркоўваліся да свят хрысціянскага календара, што уплывала на парадак іх правядзення; традыцыйна "афіцыйнае" свята адбывалася да абедні, а пасля – пачынаўся кірмаш. Шырокай



РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

вядомасцю ў гандлёвага люду карысталіся местачковыя кірмашы: Петрапаўлаўскі – у Бешанковічах, Успенскі – у Свіслачы, Вадахрышчанскі – у Любавічах, Ефраксіеўскі – у Парычах і мн. інш. Сярод найбуйнейшых трэба адзначыць знакаміты Анненскі кірмаш у Зэльве (26 ліпеня - 25 жніўня), у гонар храмавага свята Св.Ганны, які доўжыўся месяц. Па меркаванню даследчыкаў,зельвенскія кірмашы былі аднімі з буйнейшых у Еўропе і саступалі па сваёй значнасці толькі знакамітым Лейпцыгскім.

Кірмаш мяняў увесь жыццёвы ўклад жыхароў гарадоў і шматлікіх мястэчак. Так, падчас кірмашу насельніцтва Зэльвы павялічвалася ў два разы. Гісторык і падарожнік І.Крашэўскі адзначаў, што "...з вельмі даўніх часоў Зэльва і яе жыхары падпарадкоўваюцца здзіўляючаму праву, калі адзінаццаць месяцаў у годзе яны марнеюць, а толькі адзін месяц жывуць"[12, 184].

Акрамя купцоў, гандляроў, рамеснікаў, чыноўнікаў і вайскоўцаў, сялян з навакольных вёсак,на кірмашы прыязджала дробная шляхта, каб прапанаваць свае паслугі магнатам. У сваю чаргу магнаты з'язджаліся на свае саслоўныя з'езды і бавілі час у баляваннях, забавах і маскарадах. У гэты час гандлёвая плошча ператваралася ў цэнтр гарадскога жыцця, з'яўляючыся адначасова месцам святочнага гандлю і вялікай сцэнічнай пляцоўкай для выступленняў скамарохаў, "мядзведзнікаў", музыкаў, "штукароў"(акрабатаў, камедыянтаў, фокуснікаў, лялечнікаў, студэнтаў-вандроўнікаў са сцэнкамі-інтэрмедыямі). Крыніцы сведчаць аб удзеле ў святочных кірмашовых дзеях "сляпцоў-лірнікаў", якія выконвалі рэлігійныя, гістарычныя і жартоўныя песні, школа падрыхтоўкі якіх існавала каля Турава.[13, 43]. Комплекс паратэатральных дзеянняў, якія праводзіліся пад час кірмашоў на Беларусі XIV-XXстст., атрымаў назву кірмашовага тэатра.

Неад'емнай часткаю кірмашовых забаў з'яўлялася творчасць скамарохаў, аб чым акрамя гістарычных крыніц сведчаць малюнкі і гравюры. Як пэўная мастацкая з'ява скамароства ўзыходзіць да часоў Кіеўскай Русі і цесна звязана з абрадава-гульнявай культурай і фальклорнай творчасцю народа. Не парываючы сувязі з народнымі абрадамі, яны у значнай ступені садзейнічалі развіццю іх гульнявых элементаў. Скамароства не было сацыяльна аднародным, з яго асяроддзя вылучаліся вандроўныя скамарохі, для якіх адзіным сродкам існавання было іх мастацтва, а таксама – скамарохі аселыя. Сярод творчых прафесій скамарохаў крыніцы згадваюць фокуснікаў, акрабатаў, лялечнікаў, бахароў (апавядальнікаў – Аўт.), павадыроў дрэсіраваных мядзведзяў. Рэпертуар скамарохавых прадстаўленняў, па сцвярджэнню даследчы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

каў, складалі "пераасэнсаваныя абрадавыя дзеянні, сцэнкі каля-доўшчыкаў, пародыі на народныя традыцыі (вяселле, пахаванне), а таксама – на рэлігійныя рытуалы" [11, 84.]. Іх выступлення насілі адкрыты дэмакратычны характар, імправізаваныя тэксты адлюстроўвалі надзённыя праблемы жыцця людзей, а смелая сатырычная і антыклерыкальная накіраванасць відовішча спрыяла разнявольванню строга рэгламентаваных форм гарадскога жыцця.

Выключным поспехам у наведвальнікаў кірмашоў карысталіся "мядзвежыя забавы", што дэманстравалі вандроўныя скамарохі і цыганы, якія, па сведчанню Фамінцына С., "мядзведзяў вучоных па гарадах водзяць і на сурмах пры гэтым граюць". Польскія хронікі яшчэ ў XIV ст. згадваюць важакоў з мядзведзямі – "літвіннікаў", прывезеных у Кракаў беларускімі магнатамі дзеля забаў двара Ягайлы. [14, 5]. Касалапых артыстаў рыхтавалі спецыяльныя школы дрэсіроўкі. Найбольш вядомую з іх, што знаходзілася у Смаргоні, якая ў XVII-XVIIIстст. належала Радзівілам, за высокі узровень дрэсуры называлі "смаргонскай акадэміяй". Яна карысталася вялікай папулярнасцю не толькі на Беларусі, але і у Еўропе, куды неаднаразова "літвякі" вандравалі з вучонымі мядзведзямі. Аб разнастайнасці рэпертуару "выхаванцаў" смаргонскай акадэміі" сведчыць сцвярджэнне І.Вундэрэра, які яшчэ ў 1590 годзе адзначаў: "...жыхары Вялікага княства Літоўскага асабліва многа трымаюць мядзведзяў, якіх вучаць гульням, барацьбе, танцам, вярчэнню млыноў, чэрпанню вады, лоўлі рыбы". [11, 80.] Вялікая папулярнасць мядзведжых забаў у XVIIIст. робіць Павадыра з мядзведзем пастаянным персанажам лялечнага тэатра "батлейка", дзе яны атрымліваюць назву "Смаргонскі вучыцель з вучнем" [8, 293.]

Неад'емнай часткай шматлікіх кірмашовых забаў з'яўляліся выступленні школьнага тэатра. Функцыянаванне школьнай сцэны было цесна звязана з цэнтрамі, куды рэгулярна з'язджалася шляхта: на сеймы, суды, рэлігійныя святы, а таксама – на кірмашы. Разглядаючы ўзаемадзеянне вясковай і гарадской культур, неабходна звярнуць увагу на сувязь пастановак гарадскога школьнага тэатра з народнай фарсавай традыцыяй. Галоўным персанажам інтэрмедый і інтэрлюдый, якія, па сцвярджэнню В.І.Рэзанава, уяўлялі сабой "пародыю таго, што разыгрывалася ў кожнай дзеі" [15, 255], традыцыйна з'яўляўся "хлоп" (беларускі мужык-Аўт.). У інтэрмедыях, створаных на фальклорнай аснове, мужык размаўляў на каларытнай народнай (беларускай) мове, насычанай шматлікімі прыказкамі, прымаўкамі і шэрагам вобразных выразаў: "Людзей, людзей, як вады"; "Утаміўся, як сабака, пашанаваўшы яснага сонейка, краснага месячка і вас, паноў"; "У мяне, панічу, дзя-

цей, як бобу, а гароху і асьмінкі нету..."; "Калі б на панскую мудрасць не мужыцкая хітрасць, даўно б мужыкі пагіблі..." [8, 44-45.] У XVII - пач.XVIII ст. гэты персанаж выводзіўся на сцэну толькі для асмейвання апазіцыйным "хлопу" персанажам, якім звычайна з'яўляўся гараджанін - ("вучоны" студэнт, рамеснік, купец, шляхціч). Аднак эвалюцыя тэатральных інтэрмедый дазваляе прасачыць і эвалюцыю іх асноўнага героя, якога з цягам часу пачынаюць увасабляць як "істоту, вартую жалю", чалавекам "сабе на уме", пазней – як ахвяру сацыяльнай несправядлівасці, а ў канцы XVIIIст. прадстаўляюць крытычна настроенай асобай, якая "распраўляецца са сваімі ворагамі" [8, 40.] Гэта дазваляе зрабіць важную выснову аб змене стаўлення гараджаніна да селяніна не толькі ў сцэнічным увасабленні, але і у жыцці, што, безумоўна, спрыяла іх культурнай канвергенцыі.

Такім чынам, уплыў традыцыйнай народнай абраднасці ўзбагачаў мастацкую палітру гарадскіх святкаванняў, надаваў ім рэгіянальную асаблівасць і этнакультурную афарбоўку. Спалучэнне заходнееўрапейскіх з мясцовай традыцыяй за два стагоддзі выпрацавала спецыфічныя рысы і індывідуальнае аблічча гарадской святочнай культуры Беларусі, якія і сёння надаюць ёй адметнасць і непадобнасць у параўнанні са святочнымі традыцыямі ўсходнеславянскага рэгіёну.

ЛІТАРАТУРА:

1. Соколова В.К. Весенне-летние календарные обряды русских, украинцев и белорусов XIX - начала XX в. — М., 1979.

2.Гуд П.А. Народные традиции в белорусских праздниках календарного цикла.// Историко-этнографическое исследование. — Мн.,1986.

3.Sielicki F. Litaratura bialoruska do konca XVIII w.— 1985.

4.Витебская старина./Сост. А.Сапунов, Витебск. — 1883, т.5.

5.ИЮМ. Вып.1.

6.АВАК. Т.3.

7.Бандарчык В.К. Бялявіна В.М. Мілючэнкаў С.А., і інш. Грамадскі быт і культура гарадскога насельніцтва Беларусі. — Мн.: Навука і тэхніка, 1990.

8. Барышев Г.И. Театральная культура Белоруссии XVIII века. — Мн.: Навука і тэхніка, 1992.

9.Грыцкевіч В., Мальдзіс А. Шляхі вялі праз Беларусь. — Мн.:Маст. літ.,1980.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

10.Катлярчук А. С. Праздничная культура в городах России и Белоруссии XVII в.:официальные церемонии и крестьянская обрядность. - СПб.: "Петербургское востоковедение", 2001.

11. Гуд П.А.,Гуд Н.І. Беларускі кірмаш. — Мн.: "Полымя", — 1996.

12.Козловский И. Зельвенская ярмарка.// Неман. №5,1968.

13. Лабынцев Ю.А. В глубинном Полесье. — М., 1989.

14. Юр'еў П. Беларускія мядзвежнікі. //(Ніва. Беласток,Польшча). 18 верасня 1966.

15. Резанов В.И. Из истории русской драмы. Школьные действа XVII-XVIII вв. и театр иезуитов. — М., 1910.

*Цыганков Л.М.*

## ДУХОЎНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ БЕЛАРУСКАЙ ПЕДАГАГІЧНАЙ КУЛЬТУРЫ

Генетычныя карані народаў непасрэдна звязаны з узнікненнем і развіццем іх этнакультурных супольнасцей. З пакалення ў пакаленне перадаваліся ў форме вуснай народнай творчасці звесткі аб справах і падзеях мінуўшчыны. Са з'яўленнем пісьмовых крыніц пачалі закладвацца асновы гістарычных уяўленняў, а потым і навуковых ведаў.

Фарміраванню як самой беларускай народнасці, так і яе культуры папярэднічаў велізарны адрэзак часу з усімі характэрнымі для яго супярэчнасцямі і складанасцямі, што адлюстравалася і ў змесце, і ў формах культуры.

"Бацькам" нашай гісторыі лічыцца летапісец Нестар: мяркуецца, што толькі яго "Аповесць мінулых гадоў", створаная ў XI ст., вызначае ў ёй мяжу беспісьмовай эпохі.

Аднак пры гэтым упускаюцца шмат іншых фактаў. Рымскі гісторык першага ст. Тацыт гаворыць аб насяленні, якія засялілі нашу Беларусь у яго час. Аб жыхарах зямель Беларусі часоў антычнасці гаворыць чацвёртая кніга Герадотавай "Гісторыі"(480 – 404 гг. н.э.).

А што кажуць іншыя вучоныя ? Акадэмік міжнароднай акадэміі экалогіі, геранталогіі А.І. Мікуліч стварыў карту, чытаючы якую чалавек разумее, як размяркоўваюцца пэўныя гены, як змяняецца іх набор пры пераходзе з адной мясціны ў іншую. Таксама картаграфаваліся: групы крыві, рэзус-фактар, колер вачэй, бялкі крыві і марфалагічныя асаблівасці.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ